Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрациі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.—4 р. на 6 мес.—2 р. мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пак дае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 12 Чэрвеня 1915 г. № 23

## Камітэт Беларускаго Таварыства помачы пацярпеушым ад вайны.

*Адрэс: Вільня Георгіеускі праспэкт № 11. Тэл. 11—92.*

# ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце. Апошніе весткі са Штабу Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго.**

*4 чэрвеня.* «У Шавэльскім раёні, а такжэ і к захаду ад срэдняго Нёману асаблівых перамен німа. Усе нямецкіе атакі у працягу 2 чэрвеня мы адбілі. На Нарэўскім фронці за суткі бітвоў не было. На Бзуры выжэй Сохачэва мы 3 чэрвеня адбілі атаку невялікіх нямецкіх сіл. У Галіччыні барацьба не спыняецца, пры чым 2 чэрвеня найбольш заўзятые бітвы адбываліся паміж Санам і гор. Любачув і ў раёні м. Краковец. На Днестроўскім фронце ў ночы на 3 чэрвеня, на участку паміж рэкамі Цісменіцай і Стрыем, непрыяцель быў аткінуты ў безпарадку. Усяго на Днестры, выжэй Журавно, за 1 і 2 чэрвеня мы узялі у палон 202 афіцэроў і 8544 салдатоў і захапілі 6 гармат і 21 кулемётоў, яшчыкі з набоямі, абоз і іншую дабычу. Непрыяцель 2 чэрвеня перэправіўся цераз Днестр выжэй і ніжэй Ніжнёва. Часьці, перэправіўшыеся выжэй Ніжнёва, мы знiстожылі, а часьці, што перэправіліся ніжэйназванаго мейсца, ў сваім наступленьні стрыманы. Бітва ідзе. На Хоцінскім напрамку, паміж Прутам і Днестрам, 3 чэрвеня мы пасунулі непрыяцельскіе арады».

*5 чэрвеня.* «У раёні Мураўёво—Шаўлі і на Дубіссі бітвы 4 чэрвеня не прынесьлі асаблівых перамен. Вечэрам таго-ж дня на Бзуры і Равцы ад Козлова—Біскупі да Волі-Шыдловскай разгарэлася гарматняя стрэляніна. Каля Гуміна непрыяцель выпусьціў на фронце 6-ці вёрст воблако ядавітаго дыму. На правым беразі Сану наша войска з боем адыйшло за рэчку Танек і лінію Городоцкіх азёроў. Паміж Прутам і Днестрам непрыяцель, перайшоўшый крыху раней граніцу, аткінуты назад на аўстрыяцкую зямлю».

*6 чэрвеня.* «У Шавэльскім раёні без перамен. К захаду ад Нёману нямецкіе атакі на Сувальскім і Кальварыйскім напрамках, адбываўшыеся 4 і 5 чэрвеня невялікімі сіламі, мы адбілі. У раёні ўплыву Равкі непрыяцель, пачаўшый вечэрам 4 чэрвеня атаку, пасьля поўначы быў усюдох спынены. У Галіччыні, на Танеўскім фронце стычкі пярэдніх атрадоў. На напрамку к Раве-Рускай у ночы на 5 чэрвеня завязаліся бітвы ў раёні Новіны і Уліцко. З атрыманых падробнасьцей бітвы ў раёні Любачува высьветляецца, што 2 чэрвеня наша кавалерыя зрабіла вельмі заядлую конную атаку на нямецкую пехоту, с каторай увесь 91 нямецкі полк вырэзала і разсеяла. Атака гэта навела страх у нямецкім войску і спыніла іх наступленьне. На фронце Каменны Брод—Комарно непрыяцельскіе пярэдніе атрады 4 чэрвеня мецiліся прарвацца цераз праходы Городоцкіх азёроў, але былі аткінуты. Стрэляніна не спыняецца Ніжэй Ніжнёва, каля вёскі Горыгляды і Доліна, непрыяцель перэправіў цераз Днестр вялікіе сілы, але ўсе пробы яго 4 і 5 чэрвеня парывацца з глубокіх крутовін Днестра карысна адбіваліся намі каля вёсак Корэнец і Сновідов. Паміж Прутам і Днестрам ідуць заўзятые бітвы. 4 чэрвеня нашы атрады пасунуліся на фронці Онут—Баян».

*7 чэрвеня.* «У Шавэльскім раёні і к захаду ад Нёмана адбываюцца аддзельные і зацяжные бітвы. На Нарэўскім фронце 6 чэрвеня гарматняя стрэляніна каля Еднорожыца і Грудуска. На Таневскім фронце значных бітвоў не было. 6 чэрвеня непрыяцель вёў наступленьне вялікімі сіламі, паміж якімі былі сьвежа прыбыўшые з Бэльгіі атрады, на напрамку к Раве Рускай і на фронце Городоцкіх азёроў. На Днестры 6 чэрвеня не спыняліся заўзятые бітвы с перэпрявіўшыміся ніжэй Ніжнёва непрыяцельскімі сіламі. Наступаючы ад рэкі, непрыяцель пасьпеў пасунуцца да вёскі Коронец і Космежын. Але заўзятымі проці-атакамі на штыхі быў аткінуты з вялікімі для яго стратамі, прычым у адной вёсцы Космежыні мы захапілі больш за 2000 палонных і 7 кулемётоў. Паміж Прутам і Днестрам 5 і 6 чэрвеня не спыняецца заўзятая бітва. Каля вёскі Баламутовкі мы захапілі 8 кулемётоў». (Пта).

**На іншых фронтах** ваенных змаганьнёў нічога вельмі важнаго не было.

# На вайне і каля вайны.

**Адносіны Рымскаго Папы к ваюючым дзержавам.** Француская газэта «Liberte» апавесьціла абшырную гутарку свайго карэспандэнта с Папай. Карэспандэнт заявіў Папе, што маўчаньне Апастольскай Сталіцы на нямецкіе дзікіе паступкі вельмі беспакоіць Францію. На ўсе запытаньня, што адносіліся да нарушэньня нэйтралітэту Бэльгіі, забіваньня духоўнікоў, абстрэліваньня Рэймса, знiстожэньня Лувэна і «Люзітаніі», Папа атказаў ссылаючыся на запярэчываньні, якіе немцы у сваю абарону проціпастаўляюць гэтым абвінавачываньням, і заявіў, што цяпер немагчыма зрабіць акуратнаго сьледзтва. Апастольская Сталіца ня суд, але магчыма, што пасьля вайны Папа упарадкуе для будучаго права і абавязкі ваюючых. Папа прызнаў, што ўсімі сіламі стараўся працівіцца таму, каб не умешалася у вайну Італія.

**Расейская мова у Нямеччыні.** У тым часе, калі ў Расеі думаюць зусім закінуць навучаньне у школах нямецкай мовы, у Бэрліні, як пішуць нямецкіе газэты, наладжэна некольні пабочных курсоў для навучаньня расейскай мовы. Патрэба знаць расейскую мову, як кажуць нямецкіе газэты, адчуваецца ня толькі у звязку з вайной, але і маючы на прыкмеці тое, што знаёмства з мовай ворага акажыцца карысным у будычыні. Наладжэны такжэ прыватные курсы для мужчын і кабет пад кірункам прафэсара бэрлінскай ваеннай акадэміі Остэн-Сакена.

**У забранай Польшчы.** «Варш. Дн.» паведамляе, што павэдлуг атрыманых у Варшаві прыватных вестак, немцы у занятых мейсцох Польшчы у цяперашнім часі робюць генеральную топографічную знімку забранай зямлі, як у сваім вобрубе, так і ў аўстрыяцкай часьці. Працай гэтай кіруюць ваенные топографы (знімшчыкі), але самую працу выконываюць студэнты малодшых курсоў розных тэхнічных вучэльняў і нанятые каморнікі (землямеры). Дзеля друкаваньня прыгатаваных мапоў на мейсцы наладжэны перавозные друкарні. Мапы састаўляюцца з усімі падробнасьцямі, пры чым для дапаўненьня іх уселякімі спраўкамі узяты з гмінных (валасных) канцэлярый патрэбные дакумэнты. Топографы адначасьне робюць фатаграфічные знімкі розных мейсцоў, не мінаючы вёсак і мястэчак.

**Проці расейскіх грошы.** Недаўна выйшоў загад з Бэрліну спыніць абарот расейскіх грошы у занятых немцамі мейсцох Польшчы. Апошні тэрмін для абмены расейскіх грошы назначэна 1 ліпеня нов. ст., але касы казённых нямецкіх установоў, пры заплатах падаткоў, налогоў і штрафоў, расейскіх паперовых грошы (бумажак) не бяруць ужо ад 1 чэрвеня (н. ст.).

# ВЫРАЙ.

**Пасвячаю нашай моладзі.**

Я ляжу ў палатцы паміж сваякоў роднай зямлі. Тутака нас згуртавалася не адна сотня пералётных шэрых птахоў, што прыйшла з Усходу на Захад, каб спаткацца з іншымі варункамі жыцьця, з іншай прыродай, з гэткімі вобразамі, што павінны былі разварушаць нас.

Але, шэрые птахі Беларускай зямлі, чаму так спакойна азіраецеся навокал, чаму ня дзівуецеся

Заходне-Эўропэйскай культурнасьці тутэйшых жыхароў?

Гэткімі спакойнымі паміж сьпешна йдучым гуртам па вялікшых гарадох людзей я відзеў толькі англічан. Усе недзе сьпешацца, пазіраюць навокал на сьвежые твары, на пекна убраные вокны, і людцы нікнуць недзе, як шчэпкі у віры быстра плывучай рэкі. Англічанін у грамадзе гарадзкіх жыхароў выплываець нібы лебедзь паміж растрапух шэрых качэк. Спакойна і зграбна, з моцным сухапарым целам, з бліскучымі маленькімі вачамі морака глядзіць перад сабой. Гэтак азіраецца ён на пуцяводную зорку, што нерухома сьвеціць, і відзіць да патрэбнай мэты. Ніхай выюць віхры, ніхай навокал б'ець аб караб навала акіяна і трэпліць яго, як жалудзіную скарлупку... Марак трымаецца за компас, пільнуецца бліскучай зоркі перад сабой, умела чытаець мапу і з верай у сваю моц павертаець руль ў ад'значэнае мейсцо.

Англічанін і беларус, гэта — пекны лебедзь і шэрая гусь. Якая тут звязь? Але маючы вольную гадзінку парупцеся аб тым, каб запярэчыць мне і даказаць, што ўсе водные птахі—лебедзі, гусі, качкі і чыркі вылупляюцца з яек аднаго гатунку.

У нашым N батальёні сабраліся сябры аднэй беларускай губэрні, нават аднаго павету. Родная гутарка, звычаі, прывычкі. Прыйшлі мы у гэты лес, што параскінуўся на левым беразі рэчкі N з яе абшырнымі сенажацямі, затокамі, каўдобінамі. Параскінулі палаткі, наладзілі гаспадарку і жыцьцё пойшло нам, нібы тутака стаялі ня тыдзень, але месяцы, год. Што-дзень ня лёгкая праца, а пасьля усіх службовых абавязкоў, у вольную часіну парасходзіліся па сенажацях, балотах, затоках рэкі. Няведома адкуль дасталі трыгубіцу, бродзень, вялізную сетку у колькі дзесяткоў аршын, і пайшло ўсё хадыром. Тутака знайшлося не мала гнёздоў балотных птахоў. Учора хлопцы пайшлі на касьбу: бадай што працы хопіць на 2—3 тыдні, бо сенажаць заарэндавалі дзеля сваіх патрэб. Як бачыце, тутэйшые варункі жыцьця трохі падобные да нашых.

Вырай мусіць ня доўга тутака затрымаецца. Прыдзе восень, захмарыцца неба, загудзіць вецер і зноў пацягнемся. Куды? Можэ далей у няведомую краіну, ў чужыну, гдзе прыдзецца прыладжывацца да іншых варункоў жыцьця і сьмерці. А можэ—у родны край, у радзімае гняздо пад пахіліўшуюся стрэху пакінутай хаты...

Я ўжо звыкся з гэтым вандроўным жыцьцём. Перастаў думаць аб тым, каб скора да хаты вярнуцца. Жадаць чаго лепшаго дзеля сябе не варта. Трэба угаварыць сабе, што найгоршае і найлепшае, што с табой трапіцца, ніхай пойдуць табе ў карысьць. Бедаваць німа чаго. Зорка праўды, свабоды і братняго жыцьця народоў будзе сьвеціць і пасьля нас. Хапацца за шчэпкі ў акіяні будуць толькі слабые духам і сьляпые краты. Пераживуць мацнейшые, здальнейшые, рупнейшые, пераживуць лепшые гатункі людзей. Пераживуць тые, каторых злосьць векавечнай крыўды сальецца разам з любоўю да скрыўджоных братоў. Але будзе! У поўдзень усе паўкладаліся на адпачынак. Неварта кратаць сяброў гэткімі думкамі. Лепей залесьці у мярлогу (гэтак называем палаткі на 6 чэлавек), пагаманіць са сваякамі, пачытаць газэту і пагутарыць на болей спакойные тэмы.

**М. Б.**

(Далей будзе).

---

# Думкі мужыка.

7

Не-е! Хохінькі, брат! цяпер ужо не скажу, што газэты чытаць не маю часу бо блохі кусаюцца. Ясна, як на далоні; сьляпы абшчупае, дурны уцяміць. То-ж я і садок завёў, і умалот багацейшы, а бульба-ж! Дый разуўшыся і то не пералічыш усей карысьці, якую дае газэта. А даўно-ж гэта я упіраўся, як цялюк нагамі і рукамі, злаваў і крычаў, калі Глыбун — наш вучыцель — раіў завясьці друкаванае слова. Ані блізка, і слухаць не хацеў. Так і да гэтуль кляў-бы сваю долю, знімаў шапку перад чужым багацтвам, скрыгочучы з зайздрасьці зубамі. Але ў нашай вёсцы ёсь Глыбун, пастыроў сын (каб ён вечна жыў і гора не знаў!) ён нас ратуе і не адзін сусед завідуе, што мы маім гэтае шчаснае, сьветлае «але».

---

Пагода была, што называецца, аж паветра мітусілося, хоць ты у хату не варочайся. Праўда, што ў хаці мала і сядзелі. Ведама, Пятроўка — гарачы час. Пацей, Мацей. Ну але і далі-ж работы! Хапаліся адзін перад другім, замарыліся, папацелі, знемаглі.

— Добра, во, што падкацілася трое дзён сьвята: адсапнешся хоць мала-веле, — охаючы думалі.

Першые два дні сушылі пот, раўнялі костачкі — пад'ясі ды ў цянёк, а ўжо на трэцьці — дык нечаго было рабіць. Бабы з нуды разсыпаліся па вёсцы плёткі віць, абгаварываць; паміж хлопцамі ўзрасла зайздрасьць за дзеўчат, а мужчыны седзючы у Мэндэля цалаваліся, або торкалі кулакамі у нос... Эгэ-ж, справедліва сказана, што калі сядзець ціха, то апануе ліха.

Раптам вёска схамянулася, дзеці беглі па вуліцы і крычалі з жахам ва ўсю сілу: «Пошэсьць да вёскі прыйшла! Зьмей, упыр сядзіць пад старой ліпай на выгані!» Усе пабеглі, пайшлі, пакульгалі.

Пад дуплістай ліпай на ладным кургане, дзе лежыць, як кажуць закляты скарб, сядзеў белавалосы старэц з цымбаламі на каленях. Вопратка мітусілася ад золата і срыбра, на галаве была чырвоная шапка с чатырмя залатымі рагамі, перад ім у чарапку курэлі якіесь зёлкі. Ён сядзеў прысланіўшыся да ліпы, з закрытымі вачамі і сьціха пеяў песьню, памагаючы цымбаламі. Абступіўшы яго, мы пачалі пытаць:

— Скуль ты? хто ты?

Ён ўстаў падлажыў зёлак у чарапок і пад'зямельным голасам пачаў гаварыць:

— Я з далёку, багатаго боку,— цар скарбоў таёмных, вораг багоў цемных. Багат я на сілу, на добрые словы ды сыплю багата гаротным падковы. Гэй, хто кляне жыцьцё, сваю долю, хадзіце ка мне, я зніму вашы болі, навучу вас сьмеяцца, абсыплю багацьцем, памагу дакапацца да скарбаў, чырвонцаў, дам у рукі сонцэ, раскажу, што будзе... Толькі-ж, браты-людзі, (сьведкай будзь о Божэ!) я моцна галодзен, дайце, хто што можэ, хай-жэ з вас ніводзін мяне не забудзе! Не дзівуйце толькі, што я багач, а так схудаў,—кожны маіць свае болькі, хто за шмат чаго прыдбаў. Так, мой скарб не для мяне, — я жыву с подачкі. Дык-жэ літасьці браточкі дайце грашак ці капейку, хто што можэ, хай положэ мне ў шапку, а клянуся перад Богам (пацалаваў зямлю), што з вас кожны атрымае куды болей з барыпом, золата вялікі ком.

Сказаў, і сам змучэны зноў прысланіўся да дуба і запеяў сумную песьню, стрункаючы на цымбалах. Зашушукалі селяне, заварушыліся. Паміж імі запанавала нешта новае, дзіўнае, таёмнае, павабнае, і праз якісь час бэнц! медзяк у чырвоную шапку, за ім— другі, трэці... лепш, ахвотней як у скарбонку.

— Ці пазналі?—зарагатаў, сарваўшы бараду і маску, Глыбун.— Га?

Гоман. Рогат.

— Ну, годзі! Хадзіце, злічым грошы, ці будзе на газэту, а не, то я свае далажу. Я-ж бы даўно выпісаў вам, але ці-ж вы чытаць

---

# Весна 1915-я.

Дык вось-жэ як прыйшла яна—жаданая весна—  
Ў кароні з зелені і кветак, с пошэптам бяроз?!.  
Едыная с паміж былых сясьцёр сваіх яна:  
Не развясельвае душы і не ўцірае сьлёз!

Ня росы зіхацяцца брылянцістые на ёй,  
Ня росамі палеткі збожны сьвеціць на зямлі,  
А йрдзіцца ўся гарачаю чырвонаю крывёй,  
Крывёй палошчэ ўсходы, што ўзыйшлі і... не ўзыйшлі.

Ня с сонцэм выйшла блаславіць аратаго арбу,  
Ня сонцэм туліцца да скрыўджэных сяліб і хат,  
А грознымі пажарамі распачала сяўбу,  
Пажарамі — знiстожэньнем сьвяткуе сьвята сьвят.

Ня выйшоў сейбіт на загон, як ён калісь ішоў,  
Каб з верай і надзеяй кінуць зерне на прыплод,—  
А сеіць... от, абы... бо сеяць звык ён с-прадвякоў...  
Хоць і не знае, хто пажне, хто зьесьць яго ўмалот.

І хаты майскім дзераўцом не ўмаіў селянін,  
Як прадзеды умайвалі, як вучыць абычай...  
Спытай: Чаму аб спадчыне бацькоў забыў так сын?  
Атказжэ: Ведама—жалобу носіць наскі край!

Перэпалохана кабеціна з дзяцьмі на шлях  
Ідзе што-дзень пад крыж і пазірае ў даль;  
Праглядзіла ўжо вочы,—усё-ж надзея тліць ў грудзях,  
Праслухала і вушы ўжо, а слухае на жаль...

Дзяўчына, распусьціўшы косы, выляцела ў бор  
І, прытуліўшысь к дрэву, песьню жуткую пяе—  
Ніто падладжываючыся пад хаўтурны тон,  
Ніто спраўляючы ў бару заручыны свае.

А бусел, што на пірамідах зімку зімаваў,  
А лета летаваць у любы край свой прыляцеў,—  
Зьдзівіўся, пасумнеў... сваей мясьціны не спазнаў  
І не знайшоў гнезда свайго, што летась яшчэ меў.

Адно балюе баль зьвяр'ё, с сну збуджэна ў лясох,  
Пажывы на пабоішчах скрось маючы ўдаволь;  
Ды груганы, што костачкі зьбіраюць па палёх,  
Не пашкадуюць, што жылі ў такі ўсесьветны боль.

Дык вось-жэ як прыйшла весна жаданая на сьвет,  
Калоцючы, як ліпай, змучэнай зямлёй да дна?!.  
Крывёй, пажарам, пошэсьцяй—людзям яе прывет,  
А напіс на яе агнёвым знамені: Вайна!

**Янка Купала.**

Вільня 7/VI—15 г.

---

# МАГІЛА.

Апавіты у сонные імглістые сеткіранічных тумаеоў стаіць у ціхай сумнай задумі магільны гай. У пацярах прыціхлых, у ледзь чутным шопаці дрэўцоў прагледаюць чорные, абдзёртые с красы, старые, пахілые крыжы, стаячые бытцым на стражы магіл.

Ціш...

У каралеўстві цянёў павага сьмерці ледзяными аковамі абняла жыцьцё. Маўчыць прырода — якбы у жалобнай задумі — над граніцай свайго панаваньня, дзе канец жыцьця, канец той разбуялай сіле, каторая дышэ яшчэ,—сіле жыцьця. А хоць і тут родзюцца с сьмерці новые тварэньні, ды гэта ўжо ня тое: не кіпіць яно жывой думкай, гарачай сілай; гэта — штосьці, што тлее жывучы; бяздушна, непатрэбна устае, каб ізноў загінуць у небыцьці. Абраз тут панаваньня загубы, каралеўство жыцьця іншаго.

Магільнік... духі... цені.., ледзь чутны непахватны шорах, бытцым уздох сумны, бытцым енк гарачы... Аглядываешся — мігціцца недзе цень... І жутка і страшна. А таёмнасьць цягне да сябе сілай сваей неразгаднай...

На старой званніцы раз-у-раз ад'зываецца стары, абросшый іржою звон, апавешчаючы скон на зямлі — жыхара новаго магілам. А зыкі звановы доўга-доўга плывуць, дрыжачые пераліўные, над сёламі, над палямі, над сенажацямі. Куды? Хто згадаў?..

Куды падзелося тое, уцёкшы с цела, у камень яго абярнуўшы? Куды падзеліся думы з гэтай халоднай галавы с пачарнелымі вуснамі? Куды падзяецца усё, што пераходзіць і... не вертаецца назад ніколі?!

. . . . . . . . . .

Магільнік абведзены мурам, — за ім далёка - далёка раскінулася даль палёў. Дзене-дзе растуць дзікіе яблыні і грушы, або, апусьціўшы дрыжачые пад лёгкім падмухам ветру, скропленые расой хібастлівые галінкі, сумуюць бярозкі-адзіночніцы...

Чар таёмнасьці і жуткай дзіўнай цішы плыве з магіл. Прыбераючы усё колерам сумнасьці, плывучы бытцам сьпеў жальбы над сьмехам вясельля і жыцьця, думкі дзіўные будзіць...

У адзін дзень толькі — у Задушкі ажыўляецца магільнік. Убраны у кветкі, у зелень... Якбы блудные агоньчыкі на грабніцах мігцяцца. Далёка чутна шум нейкі... гоманы...

Што гэта? Ці-ж усталі целы з магіл і завуць душы свае, каб ізноў к жыцьцю ісьці?..

Не! Гэта жывые прыйшлі да памёршых. Тут маці, прыпаўшы збалелымі грудзьмі да магілы сына, стогнам раздзіраючым душу неба прабівае. Тут сірата на магілках бацькоў вырэкае на долю, што цяжкой так далася ёй. Тут дзяўчына маладая прыпадае з енкам да зямлі: пад ёй Янка яе міленькі ляжыць. Тужыць па ім дзяўчына і сьлязьмі гарачымі зямлю палівае. Там удава з малымі дзеткамі заводзіць ды галосіць:

«А нашто-ж ты мяне пакінуў?  
«А хто-ж іх раненька будзіць будзе?  
«А хто-ж працаваць іх вучыць будзе?»

. . . . . . . . . .

Уторучы гэтым жальбам-нарэканьням ра-

будзіце? Ніколі, — ведама дармовае. Во цяпер, дык вы па неколькі разоў, што да літэрыны... Знаемся на вас. Эй, ты, Цыпрук, не сушы зубы, а вось лепш бяры Цымбалы, а ты Пятрок гайды па іскрыпку! Юрку!

І падчапіўшы Пранукову Адэлю пайшоў завёўшы:

«Ах, ты, Юрачка, што ня жэнішся:
«Прыйдзе зімачка—дзе падзенішся?..»

Эх, і круціліся-ж яны! чаго толькі не даказывалі: гульні, песьні, сьмех, прыпеўкі. А цяпер, як толькі вольны час, так ужо і круцяцца вясковые каля Глыбуна, а той сабярэць хлопцоў і дзеўчат і робіць прэдстаўленьня—ўсё пад той дзюпластай ліпай; расказвае, што дзеіцца на шырокім сьвеці, чытае цікавае чытаньня, вучыць песьняў...

Ого, Глыбун! камлёвы хлапец, з яго рук капейка і ў гліне ня згіне.

Л. Р.

# Гадоушчына літоускай пісьменьніцы.

Надовічы літвіны спраўлялі 70-летнюю гадоўшчыну з дня радзін вядомай літоўскай пісьменьніцы і грамадзянскай працоўніцы, пані Жымонт, падпісываючэй свае творы прозвішчэм «Žemaitė».

Пісьменьніца гэта — жывая сьведка сумных часоў прыгону. Радзілася яна у дробна-шляхоцкай сям'і ў 1845 г., і ўсе свае дзіцячые і дзявочые леты правела у акружаючых цяжкіх варунках прыгону. Аднак з маладых лет пані Жымонт чулася вельмі зродненай з літоўскай селянскай беднатой, жыла яе жыцьцём, цярпела і цешылася яе горэм і радасьцямі. Парваўшы зусім с сваім шляхоцтвам, яна выйшла замуж за простаго селяніна, і такім чынам звязь, злучываўшая яе с селянствам, яшчэ болей умацавалася.

П. Жымонт была сьведкай першых крокоў літвіноў на грунці нацыянальнаго адраджэньня. Ідэя адраджэньня літоўскаго народу заўладала ёю неразрыўна. Па сілі магчымасьці — ў найболей цяжкіе часіны для літоўскаго руху, калі яшчэ ўсей сілай панавала забарона друкаваньня у літоўскай мові,—п. Жымонт на дзелі працавала для гэтай ідэі. Як пісьменьніца, выступіла яна досіць позна: на 48-м гаду свайго жыцьця (у 1896 г.), калі першы раз паявіліся яе творы ў выдаванай за граніцай часопісі «Varpas», пасьля ў «Ukininkas» і «Naujienas».

Разумеіцца, што ў літэратурных творах п. Жымонт адбілося тое, да чаго пісьменьніца больш за ўсё была прывязана: жыцьцё народу. У цэлай вязанцы апаведаньнёў, друкаваных ў часопісях і асобных выданьнях, п. Жымонт апісывае з усіх старон народны быт, характэрные яго асаблівасьці. Яна не зачыняець вачэй на благіе паступкі народа: наадварот, яна выстаўляець і іх на вока, але робіць гэта с такой любоўю к сваім сыйшоўшым з добрай дарогі братом, с такімі чыстымі пажаданьнямі, што яе творы яўляюцца якбы заклікаваньнем к асвабаджэньню народа ад гэтых благіх старон яго жыцьця, ад нялюдзкіх паступкаў, заклікаваньнем к барацьбе з імі. Праўдзівая шчырасьць, здольнасьць прыкмеціць самае важнае, лёгкасьць перэсказу, чыстата мовы—вось асаблівые прыкметы ня толькі апаведаньнёў і аповесьцей пісьменьніцы, але і многачысьленых яе стацей аб грамадзянскіх справах, асабліва захапліваючые чытача.

Найбольшаго развітку творчэсьць п. Жымонт даходзіць у тым часі, калі, нарэшці, была зьнята забарона, наложэная на літоўскае друкаванае слова ў 1865 г.,—калі надыйшла магчымасьць аткрыта гаварыць перэд народам у свабодна друкаваных часопісях і кнігах. І п. Жымонт прыймае самы шчыры удзел у віленскіх дэмократычных часопісях, як «Lietuvos Ukininkas», «Lietuvos Žinios», у літоўскіх календарах і інш.

Апрача літэратурнай і публіцыстычнай працы, п. Жымонт да апошняго часу працавала на грамадзянскім грунці, — і, паміж іншым, ня гледзючы на свае 70 год, кіруець сама асабіста прыпынкам для дзяцей уцекачоў.

Гадоўшчына, ат сьвяткаваньня каторай п. Жымонт атказалася наперад, прайшла пры вельмі сумных варунках: пісьменніца, ўсяго толькі 21 мая г. г. выйшоўшая с турмы, дзе адбывала кару за літэратурную справу, за тры дні да гадоўшчыны цяжка захварэла. Пажадаймо-ж шчырай літоўскай грамадзянцы як найхутчэй выздаравець, каб яна магла яшчэ шмат год рабіць сваю карысную, грамадзянска-чэлавечую работу — для свайго народа. І хай гэта літоўская працоўніца паслужыць жывым прыкладам для нашых інтэлегентак-беларусак, с паміж каторых шмат ужо сябе праявілі як здольные пісьменьніцы і грамадзянскіе працоўніцы, але ўсё яшчэ не адважуцца сьмялей і шчырэй выступіць с сваей працай на карысьць роднаго краю-Беларусі.

* * *

Зноў весна... Зноў зялёны бярозавы гай!
Зноў у ім песьні птушкі пяюць;
Зноў бурліць там халодны ручай
Й краскі шопат таёмны вядуць...
Не магу зразумець аднаго:
Ад чаго
У руччы часам муціцца дно
И чырванеюць лісткі у бяроз?

Зноў весна... Як дыван, зеляneіцца рунь на палёх—
Хлеб — багацьце людзей — там расьце.
Нізабавам пачнецца касьба на лугох,
За травой й збажына атцвіце...
А які-ж у нас будзе ураджай?..

Хай-жэ, хай
Не зрудзее й ня згоркне зярнё
Ад пралітай крыві і ад сьлёз!.

Ю. Ф.

Кіеў, 7/V, 1915 г.

# Вольны шлях.

Конь наш птушкаю нясецца
Ца палянцы, па лясной;
Заліваецца—сьмяецца
Наш званочэк пад дугой.
Вёска зьнікла—ўжо далёка,
Перэд намі вольны шлях:
Разаслалася шырока
Кветна вопратка ў палях..
Як чароўна ў полі мглістым:
Срэбны месяц вун усплыў—
Сьветам белым і іскрыстым
Усё навокал пасрыбрыў.
А ўвярху сьмяюцца зоры;
Ноч пануе на палях.
Проч ідзі ты, злое горэ:
Перэд намі вольны шлях!

Я. Журба.

# На моры.

Шуміць вада, хвалюе морэ,
Карабль мой быстра ў даль ляціць,
І песьня вольная с прастору
Мне душу, сэрцэ весяліць.
Прад мною быстра пралетаюць
Чужыны дальняй берагі,
І я душой успамінаю
Пра край радзімы, дарагі.
Павей мне, вецер, на пуціні,
Тужэй мой парус нацягай,
І у краю маім судзьбіну
Шчасьлівым днём успамінай.

А. Гурло.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Абавязываючые пастановы.** Пад штрафам да 3000 р. або да 3 мес.

скалыхаўшыся заенчыў звон на званніцы. Ціжбы боль людзкі яму удзяліўся, і сваім зыкам хацеў заглушыць яго — слухаць больш нямогучы?

У мінуту, калі над кожнай амаль магілай відаць было кагосьці, што абліваў яе сьлезамі, туліў галаву змучэную і грудзі збалелые, — вецер аднекуль наляцеў ды завыў такім жалем глухім, ажно дрогнулі агоньчыкі сьвечак, паспалохаліся дрэвы і прыгнулі да зямлі кароны свае.

— Што гэта? Што гэта?—шапацела усё.

А вецер выў, якбы хтосьці, што доляй забыты, жальбай даўно устрымліванай бўхнуў цяпер, жальбай, што сьвет з глыбін парушае.

Недалёка за мурам магільніка расла адна бярозка, тоненькая, маленькая, а пад ёй прытулілася сумная магіла. Не было там ані сьвечак, ані зелені. І ніхто там плакаць не прыйшоў. У гэты дзень—дзень успамінкоў—ніхто не прыпаў да яе гарачымі грудзьмі, ніхто ня кінуў вязанкі кветак, не запаліў мігатлівых аганькоў... А звон не для яе званіў: бо звон з высокай званніцы ня звоніць ніколі над магілай самагубцы...

Далёка ад крыжоў выкапалі магілу яму. Самагубца усе баяцца — ніхто сюды не прыйшоў да грэшніка. А калі здарыцца прайсьці каму міма, — хутка уцекае хрысьцючыся, бо баіцца, каб заклятая душа гэта не зьмянілася у якую мару страшэнную. Бо яго-ж духоўнік хаваць не хацеў і вадой сьвянцонай не акрапіў.

Як сабаку яго закапалі!.. І ляжыць адзін здалёк ад магіл сьвянцоных і ніхто над ім не ўздыхне. Бярозка-адзіночніца толькі сыпне часам брылянцістай расой і шуміць ціха... ціха... А з вясной як прылятуць птушкі, яны толькі пяюць над ім аб дзівах заморскіх і пытаюць бярозку аб вёсках с краю і аб людзёх нашых... А бярозка ціха-ціха шапаціць ім аб зямельцы роднай нашай і сумнай долі таго, што тут лёг пад яе ценем. А страшные, відаць, тые апавесьці, бо моўкнуць птушкі усе, толькі песьняр магільніка — салавейка заводзіць жаласьліва... Якбы аб гэтай балесьці бязмероў жаліцца ды плачэ прырода уся.

С. Владычанка.

24/V—15.

# Вечар у сяле.

Сонцэ ўжо нізенька і незадоўга зусім схаваецца. Маленькіе жоўта-зелёненькіе лісточкі на бярозках радасна купаюцца на сонейку. Патоптаная траўка і кветкі сталі падыймацца і ўбіраць у сябе цёплую расіцу. Птушкі паседалі на-нач і замоўклі, а на іх мейсцо вылазюць с цёмных куткоў першые вясеньніе сьпевакі — жабы.

— Трррр-тррр-тррр!—пачала адна, пасьля—другая і трэйцяя, а там цэлые сотні без перастанку завялі свае удалае тррр!..

Селянін ідзе с сяўбы с сваім памоцнікам-сынком Міхалкам і ня можэ нарадавацца, як жэрэбятка, задраўшы хвосьцік, віхрам носіцца каля кабылы. Міхалка хоць і прытаміўся, ходзячы за бараною, але ня можэ спусьціць ачоў с свайго рыжаго стрыгунчыка.

— Міхалка, Міхалка!—гаворыць, падыйшоўшы да іх воза Хведар, каторы разам ехаў з імі с поля, — што ты хочэш за свайго жарэбчыка?

— Нічога не хачу! — са злосьцю буркнуў Міхалка. — Я яго і за сто рублёў не прадам.

— Ну, дык давай паменяем на майго сіўчыка, — майму ужо 2 гады і скора можна будзэ запрагаць, а с твайго што? Кармі яго, Бог знае колькі, дый невядама які яшчэ ён вырасьце.

— Давай ты мне хоць дзесяць такіх, як твой, сіўчыкоў, дык і то не паменяю. Мало што ваш цяпер большы, як пабудзе наш, то вырасьце два разы большы, як ваш, — кажэ Міхалка.

— Чуеш, Міхалка: паменяй! — гаворыць бацька, усьмехаючыся,—мы, Бог дасьць, прычэкаем, што зноў кабылка прывядзе такога.

— Татачка, лепей вы таго паменяеце, што будзе,—просіць у бацькі Міхалка,—а гэтаго я нікому не аддам.

І Міхалка ня можэ уседзіць на возі; каб мог то ўзяў-бы і схаваў-бы стрыгунка за пазуху, каб ніхто не бачыў і не забраў-бы у яго.

Пад'ехалі да села, а там ужо авечкі бягуць і крычаць ва ўсё горла. Старые і малые бягуць за імі, каб знайці сваіх.

Сястрычкі, як угледзілі Міхалку з возам, пакінулі авечак, а самі да воза і, як ўюны, ўюцца. Злез бацька, пасадзіў іх, вязе. Маці адчыняе вароты і нясе Міхалку кусочэк сьвяточнаго пірага за тое, што ён баранаваў. Ухапіў Міхалка пірог і сам не знае, куды ісьці: ці ў хату, ці яшчэ падзівіцца на стрыгунка.

З радасьцяй і гордасьцяй бярэ ён торбачку, што бралі ў поле с хлебам і выняўшы астаткі дае сястрычкам і гаворыць. — «Наце, гэта вам зайчык гасцінца прыслаў!» А пасьля ўжо ў хаці дзеліць паміж імі каменчыкі, каторые знайшоў, і сьвісточкі і расказвае, як ён знайшоў жаўручково гнязло. Дзеці глядзяць на Міхалку, як на бывалаго вытрашчыўшы вочы і слухаюць, як ён усё бачыў.

Выйшоў Міхалка на вуліцу і чуе крык хлопчыкоў. Забыўшы ўсё змучэньне, пабег ён к таварышам, узяў палку і давай гуляць у «пікара».

— Міхалка! — гаворыць маці, — ідзі да хаты, дзецятка, класьціся спаць, а то ты і так нацягаўся за бараною.

— Зараз, мамачка, я іду! І Міхалка яшчэ з большай ахвотаю гуляе с хлопцамі. Прыходзіць аднаго с хлопцоў бацька і гоніць хваросьцінай да хаты ўсіх.

А па сяле разносюцца песьні і сьмех дзеўчат і хлопцоў.

Прынесла маці малака, падаіўшы карову, і забяліла вячэру. Увайшоў бацька, управіўшыся каля гаспадаркі, і ўсе давай сёрбаць на цэлу хату.

Цераз мінут 20 дзеці ужо сьпяць, гдзе каторае ўпало, і толькі адна маці пялешчыцца каля пасуды, бармочучы пад нос пацяры.

А. Язьмен.

турмы: 1) забараняецца купляць і вывозіць з граніц віленскай губ. у працягу чэрвеня г. г. сталую рагатую жывёлу; 2) забараняецца у дзьвінскім ваенным округу прадаваць каму небудзь або купляць, аднальнова як ад раненых і хворых салдатоў, так і ад іншых асоб тые часьці адзежы, бялізны і вобуві уселякаго фасону, якіе атрымалі або яшчэ атрымаюць ад казны ці грамадзянскіх установоў пры увальненьні іх з войска або з лекарняў; 3) ня толькі па гарадох, але і па вёсках і мястэчках кожны новапрыбыўшы жыхар павінен быць заяўлены ў належным мейсцы для прыпіскі; 4) ад 1 чэрвеня урад назначыў у віленскай губ. спіс жывёлы; дзеля гэтаго вось кожны гаспадар павінен абавязкова прыгнаць у прызначэнае мейсцэ і дзень ўсю, якую маіць жывёлу.

**К забароне прыезду ў Вільню.** Хто хочэ цяпер прыехаць у Вільню у якіх справах ці на даўжэйшае жыцьцё (у апошнім выпадку можна толькі, калі лічыцца пастаянным жыхаром Вільні да 1 ліпеня 1914 г.), той павінен падаць аб гэтым на імя губэрнатара просьбу віленскаму паліцмэйстру аб выдачы належнаго сьвядоцтва для ўезду.

«Віл. Вѣстн.» паведамляе, што стасоўна да прыказу глаўнакамандуючаго Паўночна-Заходнім фронтам, начальнік Паўночна-Заходніх чыгунак загадаў усім кандуктаром, каб перад прыходам ўсіх кур'ерскіх і пасажырскіх поездоў на станцію Вільня зачыняялі дзьверы у вагонах на ключ, а гэта дзеля таго, каб жандармская паліцыя магла зробіць кантроль (праверыць) едучых пасажыроў.

**З заседаньнеў Камітэту Беларускаго Таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны.**

I. Аткрыта паселішчэ для ўцекачоў у Вільні на Лосёвай дачы. Апекуном паселішча выбраны пан Клім.

II. Пастаноўлена паслаць паўнамочаных Таварыства: В. І. Ластоўскаго у Віленшчыну і Вітэбшчыну дзеля аткрыцьця аддзелоў таварыства, і П. П. Алексюка у пацярпеўшые ад вайны мейсцы Гродзенскай губ. дзеля арганізаваньня помачы.

III. Пачотным членам Таварыства выбраны С. К. Жывопісцэв.

IV. Выданы падмогі некольком асобам.

**Дзельба казённай пажычкі.** Атрымаваную горадам Вільняй казённую пажычку 500,000 руб. пастаноўлена так падзяліць на патрэбы выкліканые ваенным часам: 1) 300,000 р. на змаганьне с пошэсьцямі; 2) 40,000 р. на запамогі дабрачынным установам; 3) каля 10,000 р. на запамогі для сем'яў пакліканых на вайну, 4) 20,000 для уцекачоў з мейсцоў захопленых вайною. Рэшту гэтых грошы прызначэна на інш. расходы, звязаные с перажываным ваенным часам.

**На змаганьне с пошэсьцяй.** С прычыны магчымай быць пошэсьці у нашым краю, віленскі губэрскі лекарскі аддзел выпрацаваў плян будовы 10 баракоў (асаблівых будынкоў) для хворых на заразные хваробы пры сельскіх лекарнях у віленск. губ. Кожны с такіх баракоў будзе мець па 20 ложкоў.

**Суд.** Аддадзены пад суд віленскай судовай палаты судзебны сьледавацель 1 уч. барысоўск. п., А. Андрэев, за тое, што зневажыў у прашэньні таварыша пракурора. Пад суд гэтай-жэ палаты аддадзена гарадавога з Дзісны, Ф. Рымдзёнка, за тое, што ён без ніякай патрэбы параніў шабляй арыштаванаго П. Лісоўскаго ў галаву і пакалечыў яму левае плячо.

**Ваенна-акружны суд** надовічы засудзіў на год у дысьціплінарные батальёны салдатоў: К. Юркевіча, В. Крывеля і І. Жукоўскаго, вінавачэных у самавольнай адлуцы ад сваей каманды на полі бітвы. На гэту-ж самую кару засуджэна за ўцёкі з войска А. Блізьняка. Салдата Левіна гэты суд засудзіў на 2 с паловай мес. ваеннай турмы за тое, што ён самавольна адлучаўся ад сваей каманды, п'янстваваў і нарэкаў на загады ўласьцяў.

## З Міншчыны.

**На электрычны трамвай.** Мінскаму гарадзкому управленьню пазволена пазычыць 300,000 руб. на выкуп конкі і будову электрычнаго трамваю.

**Ахрана чыгунак.** «Мінск. Газ. Коп.» паведамляе, што Пінскі паліцмэйстар выдаў вось якое апавешчэньне: «Не зважаючы на выданую с прычыны ваенных варункоў забарону прыбліжацца к вартаваным часавымі жалезнадарожным пастройкам, жыхары аколіц, пагранічных с чыгункай, усё такі прыбліжаліся к вымененым пастройкам, цераз што часовые змушэны былі ужываць аружжа. Апавешчаю жыхаром горада, дзеля перасьцярогі ад магчымых несчасных здарэньнеў, што асобы пазволіўшые сабе прыбліжацца к жалезнадарожным пастройкам, вартаваным часавымі, будуць выстаўляць на небасьпечнасьць сваё жыцьцё».

**Штрафы і арышты.** Мінскі губэрнатар аштрафаваў на 3000 р., або на 3 мес. пасядзець, мінскага купца Х. Залкінда за тое, што не хацеў прадаць цукру маючы яго ўдавоць, каб падняць цану, і барысоўскаго купца Н. Бэрнштэйна за укрываньне цукру з гэтайжэ мэтай. Гэты-ж губэрнатар пасадзіў пад арышт на 3 мес. аднаго несвіжскаго жыхара і аднаго жыхара г. Баранавіч, за патайную прадажу сьпіртных напіткоў.

**Пажары.** Выгарэло мястэчка Капаткевічы, мазырск. пав. Згарэла вёска Таргуны, барыс. пав. Агонь зністожыў 93 вясковых сялібы. Страты каля 30,000 р. У вёсцы Тале, бабруйск. пав. выгарэла 64 хаты і 216 халодных будынкоў. У агні згінула 4-летняя дзяўчынка. Страты больш як на 50,000 р. У вёсцы Рукоўцы, бабруйск. пав. згарэла 14 гаспадарскіх сяліб з усім дабром. У агні згінула 57-летняя селянка А. Кастусёва. Згарэла такжэ 40 штук жывёлы, 44 авечкі і 25 штук сьвіней.

**З Дзьвінскай крэпасьці.** Камэндант гэтай крэпасьці выдаў абавязываючу пастанову, па каторай пад карай штрафам да 3000 руб. або да 3 мес. турмы і высылка з району крэпасьці, забараняецца прыбываць у крэпасны район асобам, не маючым тут пастаяннай аседласьці. Хто хочэ у якім інтэрэсі прыехаць, той павінен мець апрача пашпарта, яшчэ і пасьведчэньне асабістае ад паліціі.

## З усіх старон.

**2 чэрвеня памёр Вялікі Князь Канстанцін Канстанціновіч,** стрыечны Дзядзька Гасудара. Вялікі Князь быў прэзыдэнтам Імпэратарскай акадэміі навук і меў славу здольнаго і шчыраго паэта. Спрыяў адраджэньню недзяржаўных народоў у Расеі, як напр. украінцам; так што пры ім акадэмія старалася, каб пазволена было украінцам свабодна карыстаць роднай мовай. Памёр Вялікі Князь, пакінуўшы па сабе праўдзівы жаль і добрую память, як аб чалавеку сьветлым і справедлівым.

**Аб ратніках 2-га разраду** (с сінімі білетамі). „Kur. Lit.“ у сьлед за «Мінск. Газ. Коп.» паведамляе, што паводлуг весткі атрыманай ад міністэрства таргоўлі і промыслоў, у часі маючаго быць прызыву ў ваюючую армію ратнікоў апалчэньня 2-га разраду яны будуць узяты толькі с чатырох малодшых гадоў.

**Перамена у міністэрстві.** Міністэр унутрэнных спраў Маклаков атрымаў атстаўку, а на яго мейсца прызначэны управляючы Гасударственным коннаазаводзтвам, камэргер Царскаго Двара, князь Шчэрбатов.

**Аб скупліваньні збожа на пні.** У радзі міністроў паднялі праект, каб ужо пачаць даваць задаткі дваром, сельскім обчэствам і коопэратыўным таварыствам на збожэ, каторае павінна купляцца ў іх цяпер на пні. Гэта дзеля таго, каб заўчасу забасьпечыцца запасам хлеба для арміі і каб абыйсьціся без прымусовай рэквізыціі збожа.

**Аб лётэрэі.** Разыгрываньне білетоў дабрачыннай лётэрэі 1-го выпуску (зялёных) ўжо закончылася. 100,000 р. выйграў білет № 76, сэрыя 19,875. Разыгрываньне 2-га выпуска гэтых білетоў (ружовых) пачнецца 20 чэрвеня г. г.

**Шлюбы (венчаньне) у пост.** Св. Сынод пастанавіў пазволіць жаніцца у часі Пятроўскаго посту асобам, атпраўляючымся у ваюючую армію або ў флот. Астаўшымся дома жаніцца у Пятроўку не пазволена.

**Прыпынкі для дзяцей.** Рада міністроў зацьвердзіла правілы аб сельскіх прыпынках для дзяцей, бацькі каторых згінулі або ранены на вайне, узростам да 17 год бяз розніцы веры, народнасьці і роду. Прыпынкі будуць наладжывацца за грошы земскіх і гарадзкіх установоў, Раманаўскаго камітэту, навуковых округоў, брацтвоў, гаспадарскіх таварыстоў і інш. грамадзянскіх установоў а такжэ прыватных асоб пры запамогі с казны.

**Судовы прыгавор над дэпутатамі** ужо споўнены. 5 чэрвеня у поўнач на Мікалаеўскі вакзал (у Петраградзі) пад сільнай стражай былі дастаўлены для атпраўкі у ссылку засуджэные на пасяленьне дэпутаты соц.-дэмократычнай фракцыі IV Гас. Думы, Петровскій, Муратов, Бадаев, Шаглов, і Самойлов і засуджэные па тэйжэ справі пісьменнік Розэнфэльд, студэнт Яковлев і рабочые Ліндэн і Воронін. Усе яны былі адзеты у арыштанцкую адзежу. Нікога с сваякоў, апрача жонак, да дэпутатоў не дапусьцілі. З агульнаго вялікаго гурту дэпутаты былі выдзелены і іх памясьцілі у асобным вагоні, каторы ідзе без перэсадкі да Красноярска.

**Праект пераносу сталіцы.** Аб гэтым праекці такую вестку перадрукоўе «Kur. Lit.» з «Гол. Москвы»: «Даведываемся, што міністэр судоў Шчэгловітов і таварыш міністра судоў Гльяшэнко разам з іншымі вышэйшымі дастойнікамі паднялі пытаньне пераносу расейскай сталіцы с Петраграду у якінебудзь іншы горад у Расеі. Паміж іншым гаварылося аб праекці пераносу сталіцы не ў Маскву, як паведамлялося ўперад, а ў Кіеў, або ў Крым. Перанос сталіцы у Крым тым заслугівае на ўвагу, што з аткрыцьцем Дарданелоў Крым будзе мець вялікае торговае значэньне і яго эканамічны узрост будзе быстра пасовывацца наперад.

**К маскоўскім зборышчам.** «Рускіе Вѣд.» паведамляюць, што цяпера арыштована ужо некольківсот асоб, прыналежных к бывшым у Маскве здарэньням 28 мая.

**Адозвы к жыхарам.** У правінціі як і ў Петраградзі, ўласьці ужываюць уселякіх способаў дзеля успакаеньня жыхароў. Глаўноначальствуючые Казанскай, Разанскай і Яраслаўскай губэрній, выдалі прыказы, у каторых заклікаючы жыхароў к супакою, забараняюць уселякіе дэмонстратыўные паходы на вуліцах.

**Закрытае таварыство.** У Маскве асобае прысутство у справах аб таварыствах і хаўрусах закрыло таварыство пад названьнем «Обшчэство міра».

**Арышт.** У Петраградзі пасьля обыску паліцыя арыштавала М. Крывошлыка, бывшаго 23 гады рэдактарам «Вѣд. Петроград. Градонач.»

**Нешчасьце.** У Горлоўцы (батумск. обл.) ў капальнях угля засыпало 7 углекопаў — 4 адратавалі а трох выцягнулі нежывымі.

**За збор ахвяр на ваеннапалонных,** з горада Рэвеля па загаду ваенных ўласьцяў высланы у Енісейскую губэрню пад над'зор паліціі 7 асоб з важнейшых мейсцовых станоў.

**Сьнег.** Як паведамляе «Веч. Вр.», у Петраградзі 5 чэрвеня ішоў палосамі сьнег, зьмяніўшыся пасля у град.

**Беларускае Таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны ат 3 да 10 чэрвеня атрымала ахвяры:**

| | |
|---|---|
| Ад п. С. К. Жывопісцэва почтай | 100 р. — к. |
| » » А. Пелешы | 3 р. — к. |
| » » Р. Раксімовіча | 1 р. — к. |
| » » кс. Фр. Пекуш | 3 р. — к. |
| » » кс. Кулеша | 1 р. — к. |
| » » кс. Цэгельскаго | 1 р. — к. |
| Усяго | 109 р. — к. |

**Камітэт Т—ва складаець ахвяраваўшым шчырую падзяку.**

Рэдактар-Выдавец **І. Луцэвіч.**

Фірма сталася годнай падзякі ЯГО ІМПЕРАТАРСКАГО ВЯЛІЧЭСТВА ГАСУДАРА ІМПЕРАТАРА **12 праўдзівых фотографій толькі 1 р. 50 к.** і др. танные цэны. —да 21 чэрвеня—Прыдворные Е. В. Ш. П. фотографы **Бр. БУТКОЎСКІЕ** конная, 5. Тэл. 375 Высоч. Падар. Падзяка Папы Пія Х. 4 зал. мэд. і др. нагр. Вечн. партрэты на фарф. для памятк.

Дозволено военною цензурою.

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20·